АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

# Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР

## Гісторыя Беларусі, X клас

**І. А. Панкевіч,** настаўніца гісторыі ДУА «Дзіцячы сад—сярэдняя школа п. Юбілейны» Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці

Ты з Заходняй, я з Усходняй
Нашай Беларусі,
Больш з табою ўжо ніколі
Я не разлучуся.

*Янка Купала*

**Задачы:**

*навучальныя:* вызначыць асаблівасці знешнепалітычнай сітуацыі ў Еўропе ў 1930-я гг., найважнейшыя палітычныя захады савецкага кіраўніцтва, накіраваныя на ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, сутнасць сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных пераўтварэнняў у Заходняй Беларусі;

*развіццёвыя:* фарміраваць навыкі работы з ілюстрацыяй, картай, гістарычнымі дакументамі і матэрыяламі вучэбнага дапаможніка;

*выхаваўчыя:* выхоўваць у вучняў павагу да гістарычнага адзінства шматнацыянальнай беларускай дзяржавы.

**Тып урока:** вывучэнне новага матэрыялу.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік, карта «Фарміраванне тэрыторыі БССР», партрэты С. В. Прытыцкага, С. Ф. Струга, раздатачны матэрыял, відэаматэрыялы «Заходняя Беларусь: страчаныя ілюзіі», «Мяжа на захадзе».

### Ход урока

*І. Арганізацыйная частка.*

Прыём «Камплімент». Вучні сядзяць па крузе, настаўнік кажа камплімент аднаму з школьнікаў злева, той — наступнаму. Апошні з круга гаворыць камплімент настаўніку, і такім чынам ствараецца добразычлівы псіхалагічны настрой.

**Настаўнік.** Сёння мы будзем складаць гістарычны альманах. Адновім некаторыя веды, атрыманыя на папярэдніх уроках Сусветнай гісторыі, пагуляем у «Гістарычную размінку». Калі сцвярджэнне правільнае — падыміце руку, няправільнае — не падымайце.

1. Палітыка, якая праводзілася ўрадамі Францыі і Вялікабрытаніі датычна фашысцкай Германіі напярэдадні Другой сусветнай вайны і прадугледжвала ўступкі Германіі і іншым фашысцкім дзяржавам у абмен на захаванне міру, — палітыка «супакойвання» агрэсара. *(Так.)*



gisdapamoga.bspu.by

2. З прыходам да ўлады Гітлера курс Германіі на передзел свету можна характарызаваць як рашучы. *(Так.)*

3. Палітыка, накіраваная на передзел свету, ажыццяўлялася Германіяй. *(Так.)*

4. Па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора тэрыторыя Заходняй Беларусі адышла да Польшчы. *(Так.)*

5. Палітыкі калектыўнай бяспекі прытрымліваліся СССР, Англія і Францыя. *(Не, толькі СССР).*

***ІІ. Новая тэма.***

— Цяпер вызначымся з назвай альманаха. Прачытайце радкі Янкі Купалы (эпіграф) і адкажыце на пытанні:

1. Якая ідэя знайшла ўвасабленне ў гэтых словах? *(Ідэя адзінства беларускага народа.)*

2. Ці спраўдзіліся словы Купалы? *(Адказы.)*

— Зыходзячы з названага вамі, якую назву будзе мець альманах (тэма нашага ўрока)?

Паведамленне пытанняў тэмы ўрока, запіс яе на дошцы і ў сшытках вучняў.

— Размясціце ў альманаху главы, яны ж — пытанні для вывучэння на ўроку.

**План**

**1.** Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

**2.** Стварэнне органаў савецкай улады ў Заходняй Беларусі.

**3.** Рашэнні Народнага сходу. С. В. Прытыцкі.

**4.** Гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі пасля аб'яднання з БССР.

**5.** Гістарычнае значэнне аб'яднання беларускага народа.

— Ці можна лічыць уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР актам гістарычнай справядлівасці? *(Адказы.)*

— Вы ведаеце, што шлях да нацыянальнага адзінства і суверэнітэту беларускай дзяржавы быў доўгі і супярэчлівы. Шмат разоў тэрыторыю Беларусі дзялілі больш моцныя суседзі. Так адбылося і ў 1921 г., калі Заходняя Беларусь адышла да Польшчы. Змаганне беларускага народа за адзінства прывяло да перамогі, і ў 1939 г. БССР і Заходняя Беларусь уз'ядналіся.

— Пачнём работу з прадмовы да альманаха. Яго распрацавала вучаніца *(імя)*. Яна паведаміць аб падзеях, якія папярэднічалі ўз'яднанню Заходняй Беларусі з БССР.

Вучні праглядваюць відэафрагмент з фільма «Мяжа на захадзе» (кінастудыя «Беларусфільм», 1989 г.).

— Чым была выклікана неабходнасць уступлення Чырвонай Арміі на тэрыторыю Польшчы? *(Адказы.)*

Настаўнік расказвае пра «Дагавор аб дружбе і граніцах» паміж СССР і Германіяй.

— Дагавор стаў свайго кшталту дадаткам да заключанага 23 жніўня 1939 г. пакта Молатава—Рыбентропа. Перамовы працягваліся тры дні і былі ініцыяваны па просьбе савецкага боку. Фармальнай зачэпкай для іх пачатку сталі акупацыя Польшчы і далейшы яе падзел.

— Наступная глава называецца «Стварэнне органаў савецкай улады ў Заходняй Беларусі». Першая мікрагрупа павінна вызначыць органы мясцовай улады і іх функцыі ў гарадах. Другая мікрагрупа вызначае органы мясцовай улады і іх функцыі ў сельскай мясцовасці.

Вучні працуюць з матэрыяламі падручніка на с. 117, 2—3-і абзацы, знаёмяцца з фотаздымкамі таго часу: падзел памешчыцкай зямлі, стварэнне органаў улады *(Дадатак 1)*. Затым вывучаецца трэцяе пытанне плана. Міні-лекцыя, заснаваная на мясцовым матэрыяле.

— Звярніце ўвагу на лічбы. Аб чым яны сведчаць? *(Адказы.)*

— Для вызначэння далейшага лёсу заходнебеларускіх зямель было вырашана склікаць Народны сход Заходняй Беларусі з выбраных насельніцтвам дэпутатаў. У пачатку кастрычніка 1939 г. пачалася падрыхтоўка

да выбараў у Народны сход. У Ваўкавыску адбыўся 5-тысячны мітынг працоўных, які прыняў рэзалюцыю: «Насельніцтва горада Ваўкавыска хоча савецкай улады і толькі яе!.. Галасуйце за савецкую ўладу, за ўваходжанне Заходняй Беларусі ў склад БССР».

— Кандыдатамі ў дэпутаты вылучаліся самыя годныя з ліку рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі. Па Ваўкавыскім павеце ў 36 выбарчых акругах такімі сталі 30 сялян, 3 рабочыя і 3 служачыя. Па нацыянальным складзе з 36 кандыдатаў 34 — беларусы. Сярод іх камуністы-падпольшчыкі І. І. Вераціла, А. І. Сарока, селянін-бядняк С. Ф. Струг і рабочы-чыгуначнік П. А. Сяўко. 22 кастрычніка ўсе яны сталі дэпутатамі Народнага сходу. Удзел насельніцтва ў выбарах склаў 97 %. У Заходняй Беларусі было абрана 929 дэпутатаў.

— Пасяджэнні Народнага сходу Заходняй Беларусі пачаліся 28 кастрычніка 1939 г. Па даручэнні групы дэпутатаў яго адкрыў старэйшы дэпутат, 68-гадовы селянін, наш зямляк, жыхар в. Маісеевічы, С. Ф. Струг словамі: «Я сам селянін-бядняк. Пры польскай уладзе не меў ніякіх правоў, а цяпер — дэпутат свайго народа і адкрываю наш Народны сход». Даклад аб форме дзяржаўнай улады ў Заходняй Беларусі зрабіў С. В. Прытыцкі.

Відэафрагмент фільма «Мяжа на захадзе».

Інфармацыя аб С. В. Прытыцкім (на аснове відэафрагмента з фільма «Заходняя Беларусь: страчаныя ілюзіі», праект АНТ).

— 29 кастрычніка 1939 г. сход аднагалосна прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўнай уладзе і Дэкларацыю аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР.

Паказ ксеракопіі Дэкларацыі аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР *(Дадатак 2)*.

— Аб чым абвяшчалася ў гэтых дакументах? *(Аб усталяванні савецкай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі Саветамі дэпутатаў працоўных.)* Які зварот тут утрымліваўся? *(Зварот да Вярхоўнага Савета СССР і БССР аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад СССР і БССР.) (Дадатак 3.)*

— 30 кастрычніка 1939 г. былі прыняты дэкларацыі аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці і канфіскацыі памешчыцкіх зямель.

Паказ ксеракопіі Пастановы аб увядзенні савецкай валюты на тэрыторыі Заходняй Беларусі *(Дадатак 4)*.

— Народны сход выбраў паўнамоцную камісію ў складзе 66 чалавек для паездкі ў Маскву і Мінск, каб перадаць рашэнне Народнага сходу аб уступленні Заходняй Беларусі ў склад СССР. Сярод пасланцоў камісіі былі прадстаўнікі Ваўкавышчыны С. Ф. Струг і П. А. Сяўко. 17 верасня Народны сход абвясціў Днём усенароднага свята. 2 лістапада 1939 г. адбылася нечарговая 5-я сесія Вярхоўнага Савета СССР. На ёй ад імя народа Заходняй Беларусі выступіў С. В. Прытыцкі. Сесія прыняла Закон аб уключэнні ў склад СССР Заходняй Беларусі і яе ўз'яднанні з БССР.

Вучні запісваюць у сшытак: 2 лістапада 1939 г. — Закон аб уключэнні ў склад СССР Заходняй Беларусі і яе ўз'яднанні з БССР.

— 14 лістапада 1939 г. 3-я нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР пастанавіла прыняць Заходнюю Беларусь у склад БССР.

Запіс у сшытак: 14 лістапада 1939 г. — прыняцце Заходняй Беларусі ў склад БССР.

— Пакажыце на карце граніцы БССР паводле стану на 14 лістапада 1939 г. А главу «Гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі пасля аб'яднання з БССР» мы распрацуем сумесна, выкарыстоўваючы тэкст параграфа на с. 120 (1—3-і абзацы). Запоўніце табліцу і дайце характарыстыку названым пераўтварэнням. Першая мікрагрупа характарызуе гаспадарчыя пераўтварэнні, другая — культурныя.



gisdapamoga.bspu.by

| Пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Гаспадарчыя** | | **Культурныя** | | | |
| Прамысловасць | Сельская гаспадарка | Адукацыя | | Ахова здароўя | Культура |
| | | школьная | навучальныя ўстановы | | |
| Аднаўляліся і пашыраліся прамысловыя прадпрыемствы, вялося будаўніцтва новых. Аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся ў канцы 1940 г. амаль у 2 разы ў параўнанні з 1938 г. | На базе былых памешчыцкіх маёнткаў пачалі ствараца калгасы і саўгасы. Адносна заможных сялян праводзілася палітыка абмежавання шляхам устанаўлення павышаных грашовых і натуральных падаткаў. Да чэрвеня 1941 г. было створана 1115 калгасаў і 28 саўгасаў, якія аб'ядналі каля 7 % сялянскіх гаспадарак. Задача ажыццяўлення суцэльнай калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі ў тыя гады не ставілася | Восенню 1939 г. было адкрыта шмат новых школ. Дзеці сялян і рабочых атрымлівалі бясплатную адукацыю | Пачалі працаваць Беластоцкі педагагічны, Баранавіцкі, Гродзенскі і Пінскі настаўніцкія інстытуты, школьныя педагагічныя вучылішчы ў Беластоку, Брэсце, Гродне, Маладзечне, Навагрудку і Пінску, дашкольныя — у Ваўкавыску і Лідзе. Працавалі медыцынскія і народна-гаспадарчыя тэхнікумы | Адчыняліся новыя бальніцы, амбулаторыі, медыцынскія пункты з бясплатным абслугоўваннем | Драматычныя тэатры, бібліятэкі, кінатэатры, дамы культуры |

— Апошнюю главу альманаха «Гістарычнае значэнне аб'яднання беларускага народа» мы таксама распрацуем разам. Выходзячы з вывучанага на ўроку, што вы скажаце пра гістарычнае значэнне аб'яднання беларускага народа? *(Адказы: уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР з'явілася актам гістарычнай справядлівасці; ўмацавала тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі; садзейнічала далейшай кансалідацыі беларускай нацыі.)*

***III. Замацаванне вывучанага*** (тэст альбо франтальнае апытанне).

**1.** Другая сусветная вайна пачалася:
*а) 1 верасня 1939 г.;*
б) 17 верасня 1939 г.;
в) 28 верасня 1939 г.;
г) 22 чэрвеня 1941 г.

**2.** Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь пачаўся:
а) 23 жніўня 1939 г.;
б) 1 верасня 1939 г.;
*в) 17 верасня 1939 г.;*
г) 22 чэрвеня 1941 г.

**3.** Пасяджэнні Народнага сходу Заходняй Беларусі пачаліся:
а) 1 верасня 1939 г.;
б) 17 верасня 1939 г.;
в) 22 кастрычніка 1939 г.;
*г) 28 кастрычніка 1939 г.*

**4.** Пасяджэнне Народнага сходу Заходняй Беларусі адкрыў:
*а) С. Ф. Струг;*
б) С. В.Прытыцкі.

**5.** Былі створаны новыя органы савецкай ***улады — часовыя ўправы і сялянскія камітэты.***

**6.** Пакажыце на карце тэрыторыю БССР па стане на 14 лістапада 1939 г.

***IV. Рэфлексія*** (ПОПС-формула).

**Я лічу,** што ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР было станоўчай падзеяй.

**Таму што** гэтай падзеі людзі чакалі доўгія 20 гадоў.

**Я магу доказаць гэта на прыкладзе таго,** што народ Заходняй Беларусі з вялікай радасцю сустракаў вызваліцеляў і аднагалосна падтрымаў ідэю ўз'яднання з БССР.

**Выходзячы з гэтага, я раблю выснову,** што савецкае кіраўніцтва паступіла правільна, арганізаваўшы вызваленчы паход у Заходнюю Беларусь.



gisdapamoga.bspu.by

***V. Падвядзенне вынікаў, выстаўленне адзнак.***

**Дамашняе заданне:** § 21. Закончыце запаўненне табліцы «Тэрытарыяльныя змены БССР (1919 — 1939)». Для дапытлівых: у кнізе «Памяць» прачытайце цікавую інфармацыю аб зменах у жыцці жыхароў Ваўкавыскага павета ў 1939 г.

*Дадатак 1*

В/срочно перепечатать по В.Ч.

60

МОСКВА, ЦК ВКП(б) –
товарищу СТАЛИНУ И.В.

По всем городам созданы Временные Управления, которые приступили к работе. Приступило к работе 30 редакций газет. Засылаются каждый день 100 тысяч экземпляров центральных и белорусских газет.

Повсеместно организованы крестьянские комитеты, приступившие к разделу помещичьей земли. Многих осадников и помещиков крестьяне истребляют (вешают, расстреливают, убивают) или приводят и сдают Временным Управлениям.

Так как первые эшелоны наших войск действовали главным образом рейдовым порядком и нигде не задерживались, а вторые эшелоны также движутся не широким фронтом, а по магистралям, поэтому есть громадное количество сел и деревень, где еще красноармейцы и политработники не побывали. Благодаря этому обстоятельству у Временных Управлений в городах каждый день громадное количество ходоков от ~~организованных~~ крестьянских комитетов или от крестьян, с самыми разнообразными вопросами: как делить помещичью землю, как организовать комитет, что делать с хлебом, который имеется в помещичьем имении, с имуществом, со скотом, что делать с хлебом, лежащим по складам и мельницам, который был поляками из'ят у населения для армии, по расчету 8 килограмм с гектара.

*Дадатак 2*

# ДЕКЛАРАЦИЯ

## БЕЛОРУССКОГО НАРОДНОГО СОБРАНИЯ ПО ВОПРОСУ О ВХОЖДЕНИИ ЗАПАДНОЙ БЕЛОРУССИИ В СОСТАВ БЕЛОРУССКОЙ СОВЕТСКОЙ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЙ РЕСПУБЛИКИ

В тяжелый час, грозивший разорением и истреблением нашему народу, Великий Советский Союз взял под свою защиту жизнь и имущество населения Западной Белоруссии.

С помощью непобедимой Рабоче-Крестьянской Красной Армии народы Западной Белоруссии освободились от господства помещиков и капиталистов. Навсегда миновали черные годы унижения белорусского народа под игом польских панов, попиравших элементарные права и национальное достоинство белорусского народа.

Трудящиеся Западной Белоруссии всегда считали себя связанными неразрывными кровными узами со своими братьями, построившими социалистическую Советскую Белоруссию.

Трудящиеся Западной Белоруссии решительно требуют воссоединения доныне расчлененных двух частей единого белорусского народа, единой белорусской земли.

Считая волю белорусского народа высшим законом, Белорусское Народное Собрание постановляет:

Просить Верховный Совет Союза Советских Социалистических Республик и Верховный Совет Белорусской Советской Социалистической Республики

**ПРИНЯТЬ ЗАПАДНУЮ БЕЛОРУССИЮ В СОСТАВ СОВЕТСКОГО СОЮЗА И БЕЛОРУССКОЙ СОВЕТСКОЙ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЙ РЕСПУБЛИКИ, ВОССОЕДИНИТЬ БЕЛОРУССКИЙ НАРОД В ЕДИНОМ ГОСУДАРСТВЕ И ПОЛОЖИТЬ ТЕМ САМЫМ КОНЕЦ РАЗОБЩЕНИЮ БЕЛОРУССКОГО НАРОДА.**

Только в составе Белорусской Советской Социалистической Республики народ Западной Белоруссии сумеет залечить глубокие раны, нанесенные ему долгими годами порабощения, и с помощью Великого Советского Союза поднять и преобразовать хозяйство, развить свою народную культуру, достойную свободного народа, и обеспечить расцвет благосостояния всех трудящихся Западной Белоруссии.

Да здравствует Белорусская Советская Социалистическая Республика!

Да здравствует наша могучая Родина — Великий Союз Советских Социалистических Республик!

Принята единогласно Белорусским Народным Собранием
29 октября 1939 г.

*ПРЕЗИДИУМ*
*БЕЛОРУССКОГО НАРОДНОГО СОБРАНИЯ:*

gisdapamoga.bspu.by

Дадатак 3

**Дэкларацыя Народнага Сабрання Заходняй Беларусі «Аб уваходжанні ў састаў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»**

Прынята аднагалосна на пасяджэнні 29 кастрычніка 1939 г.

У цяжкую гадзіну, пагражаўшую разарэннем і знішчэннем нашага народа, вялікі Савецкі Саюз узяў пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Беларусі.

З дапамогаю неперамажнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі народы Заходняй Беларусі вызваліліся ад панавання памешчыкаў і капіталістаў. Назаўсёды мінулі чорныя гады зняваги беларускага народа пад ігам польскіх паноў, папіраўшых правы і нацыянальныя дастоінствы беларускага народа.

Працоўныя Заходняй Беларусі заўсёды лічылі сябе звязанымі непарыўнымі кроўнымі ўзамі з сваімі братамі, пабудаваўшымі Савецкую Сацыялістычную Беларусь.

Працоўныя Заходняй Беларусі рашуча патрабуюць аб'яднання дагэтуль расчлененых дзвюх частак адзінага беларускага народа, адзінай беларускай зямлі.

Лічачы волю беларускага народа вышэйшым законам, Беларускае Народнае Сабранне пастанаўляе:

Прасіць Вярхоўны Савет Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі прыняць Заходнюю Беларусь у састаў Савецкага Саюза і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, аб'яднаць беларускі народ у адзіную дзяржаву і пакласці тым самым канец раз'яднанню беларускага народа.

Толькі ў саставе Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Заходняя Беларусь зможа залячыць глыбокія раны, нанесеныя ёй доўгімі гадамі зняволення, і з дапамогаю вялікага Савецкага Саюза падняць і пераўтварыць гаспадарку, развіць сваю народную культуру, дастойную свабоднага народа, і забяспечыць росквіт дабрабыту ўсіх працоўных Заходняй Беларусі.

Няхай жыве Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка!

Няхай жыве наша магутная радзіма — вялікі Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

gisdapamoga.bspu.by

*Дадатак 4*

20

Для тов.ПОНОМАРЕНКО передаю текст проекта постановления ЦК ВКП(б) и СНК СССР "О переходе на советскую валюту на территории Западной Украины и Западной Белоруссии".

В целях осуществления повсеместного перехода на советскую валюту на территории Западной Украины и Западной Белоруссии, ЦК ВКП(б) и СНК СССР п о с т а н о в л я ю т:

I. Обязать Государственный Банк перевести с I5 декабря 1939 года все расчеты государственных и кооперативных предприятий и учреждений на советскую валюту.

2. Выплату заработной платы рабочим и служащим всех предприятий и учреждений с I5-го декабря 1939 г. производить только в советской валюте, запретив выдавать заработную плату польскими злотыми.

3. Обязать государственные и кооперативные предприятия и учреждения с I5-го декабря 1939 г. производить продажу и приобретение товаров, а также заготовки сельскохозяйственных продуктов и оказание услуг (железнодорожный и городской транспорт, театры, кино, коммунальные услуги и т.п.) только на советские деньги.

4. Предложить Государственному Банку выпускать в обращение с I5-го декабря 1939 г. только советские деньги.

5. Обязать Государственный Банк прекратить с I5-го декабря 1939 г. прием польских злотых в платежи и обмен.

gisdapamoga.bspu.by